**А. У. Карач**
*Гродна, Беларусь*

# ФАЛЬШЫВЫЯ МАНЕТЫ З «ВАЎКАВЫСКАГА» СКАРБА XV–XVI стст.

Артыкул прысвечаны апісанню фальшывых манет з «Ваўкавыскага скарба» 2014 г., які складаўся з 9006 манет XV–XVI стст. і быў ухаваны ў самым канцы XVI ст. Нягледзячы на вельмі суровыя пакаранні, вытворчасць фальшывых манет ва ўсе часы была вельмі прыбытковай справай. Як правіла, падраблялі самыя папулярныя наміналы, якія былі ў абарачэнні ў дадзены перыяд. У другой палове XVI ст. такімі былі двайныя пенязі і паўгрошы.



Падробка пад паўгрош ВКЛ 1556 г. (павялічана)

У складзе «Ваўкавыскага скарба» было выяўлена 15 фальшывых манет – 2 паўгроша Жыгімонта Старога (1 – з датай 1512 г., 1 – ???? г.), 3 паўгроша (1 – 1556 г., 1 – 5655 г., 1 – ???? г.) і 10 двайных пенязяў (9 – 1570 г., 1 – ???? г.) Жыгімонта Аўгуста. Выяўленыя падробкі можна падзяліць на дзве групы: даволі высакаякасныя і дастаткова прымітыўныя. Трэба адзначыць, што сярод фальшывых паўгрошаў Жыгімонта Аўгуста ёсць манета з фантастычнай датай (5655). Прааналізаваўшы стылістычныя асаблівасці і супаставіўшы звесткі, атрыманыя пры даследаванні манет метадам ЭДРФА, аўтар робіць высновы аб спосабах вытворчасці гэтых падробак (усе экзэмпляры выкананы амальгамным метадам – шляхам нанясення каштоўнага слоя метала на медную аснову) і выказвае меркаванні аб варыяцыях тых ці іншых тыпаў падробак.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm